ля, якая з’яўляецца толькі ў адным эпізодзе як носьбіт высокай маралі, пададзенай нязмушана і ненавязліва» [3, с. 317]. Такім чынам, жанравы сінтэз рамана і дэтэктыва адметна ўплывае на раманную сітуацыю: у мікраасяроддзе галоўнага героя ўваходзіць значная колькасць асоб, кожная з якіх адыгрывае значную мастацкую ролю.

**Заключэнне.** У раман «Ноч цмока» прыўносіцца па-дэтэктыўнаму функцыянальны псіхалагізм, што абумоўлівае ўзмацненне суб’ектыўнага пачатку, у сістэме вобразаў дамінуе эстэтычны прынцып цэнтраімклівасці. Валерый Гапееў звяртаецца да міфалогіі і фальклору, у чым выяўляецца тыпалагічная блізкасць з творчай манерай Уладзіміра Караткевіча. У рамане Валерыя Гапеева, дзе ўзмоцнены элемент постмадэрнісцкай дэтэктыўнасці, спецыфічна выяўляецца хранатоп: актуалізуюцца шырокія прасторава-часавыя сувязі, якія і прадвызначаюць рэпрэзентацыю аўтарскай сучаснасці.


1. Можейко, М.А. Философия детектива: классика – неклассика – постнеклассика / М.А. Можейко // Искусство и культура. – 2011. – №1. – С. 76–82.
2. Гапееў, В. Ноч цмока : раман / В. Гапееў. – Мінск : Галіяфы, 2016. – 356 с.
3. Якавенка, Н. Міфалагічна-дэтэктыўны мікс з эратычным флёрам. Роздум над раманам Валера Гапеева «Ноч цмока» / Н. Якавенка // Дзеяслоў. – 2017. – №1. – С. 315–319.


## МАСТАЦКАЕ АДЛЮСТРАВАННЕ ДЗЕЯЧАЎ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў ПРОЗЕ М. ГАРЭЦКАГА


*Н.М. Налётава*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


На працягу XX–XXI стагоддзяў у літаратурным працэсе Беларусі перыядычна адбываліся значныя культурна-эстэтычныя зрухі, абумоўленыя пэўнымі грамадска-палітычнымі падзеямі. У адзначаны перыяд значна ўзрасла цікавасць да нацыянальнага мінулага і культурных дзеячаў, якія клапаціліся аб беларускім адраджэнні. Героямі празаічных твораў нярэдка былі абраны значныя постаці беларускай гісторыі, напрыклад, асветнікі, мастакі, грамадскія дзеячы і пісьменнікі. Сярод іх можна назваць Францішка Багушэвіча (“Пры апазнанні – затрымаць” В. Хомчанкі), Алаізу Пашкевіч (“Крыж міласэрнасці” В. Коўтун, “Стану песняй …”, “На струнах буры” і “На полымі любві” Л. Арабей), Максіма Багдановіча (“Развітанне” Б. Мікуліча, “Загадка Багдановіча” М. Стральцова), Цішку Гартнага (“Пасля нябыту” і “Без эпітафіі” Э. Ялугіна), Янку Купалу (“Ой, рана на Івана” З. Бандарынай, “Незабыўныя дарогі” і “Дарогі песняра” В. Віткі, “Як агонь, як вада …” А. Лойкі), Уладзіміра Караткевіча (“Наш Караткевіч”, “Уладзімір Караткевіч, або Паэма Гарсія Лойкі” А. Лойкі) і інш. Да мастацкага адлюстравання дзеячаў беларускай культуры звяртаўся і вядомы празаік, драматург, публіцыст, фалькларыст, педагог, лексікограф, перакладчык, даследчык літаратуры М.І. Гарэцкі (1893–1938).

Актуальнасць нашага даследавання абумоўлена адсутнасцю ў літаратуразнаўстве сістэмнага навуковага асэнсавання вобразаў нацыянальных пісьменнікаў, створаных іншымі майстрамі слова.

Мэта дадзенага даследавання – выявіць асаблівасці мастацкага адлюстравання вядомых беларускіх дзеячаў культуры ў літаратурных творах М. Гарэцкага: апавяданні “Фантазія” і аповесці “Меланхолія”.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для нашага даследавання абрана мастацкая проза (апавяданне “Фантазія” і аповесць “Меланхолія”) М. Гарэцкага. Асноўнымі для навуковага аналізу сталі прыёмы параўнальнага, канкрэтна-гістарычнага і дэскрыптыўнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** М. Гарэцкі належыць да ліку выдатных дзеячаў беларускай культуры. Вядомы літаратуразнаўца М.І. Мушынскі слушна назваў яго “гонарам і сумленнем беларускай нацыі, яе духоўным настаўнікам, які ўнёс велізарны ўклад у фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці беларусаў” [1, 381]. Сапраўды, гісторыка-літаратурнымі даследаваннямі, публіцыстыкай, мастацкімі творамі, асветна-педагагічнай дзейнасцю пісьменнік аформіў цэласную нацыянальна-адраджэнскую праграму.

Тэндэнцыя мастацкага адлюстравання не паслякастрычніцкай рэчаіснасці, а нядаўняга мінулага Беларусі ў 1920–1930 гады М. Гарэцкім была “формай апасродкаванай ацэнкі палітычнай сістэмы, да якой пісьменнік … ставіўся даволі крытычна” [1, 404], нежаданнем ствараць мастацкія творы згодна з ідэалагічнымі патрабаваннямі новага часу.




Репозиторий ВГУ

У апавяданні “Фантазія” (1921) пісьменніка згадваюцца вядомыя гістарычныя асобы, якія клапаціліся аб становішчы “Бацькаўшчыны мілай” [2, 117], развіцці яе культуры, а таксама нацыянальнай самасвядомасці суайчыннікаў. Гэта вядомыя асветнікі, гуманісты і пісьменнікі Ф. Скарына, Ф. Багушэвіч, В. Дунін-Марцінкевіч, А. Пашкевіч, М. Багдановіч, А. Гарун, С. Палуян, К. Каганец, Я. Купала і інш.

Жанравыя межы апавядання не дазволілі М. Гарэцкаму даць падрабязную характарыстыку гэтых асоб, але ў творы выкарыстоўваюцца лаканічныя заўвагі тыпу “сумны” [2, 117], “панураны” [2, 117], “ад чорных дум паніклы” [2, 118], “прамовіў горка” [2, 118] (Ф. Скарына);“сумна паглядзеў” [2, 117], “баліць душа” [2, 117] (Я. Купала) “разважны караносты” [2, 119] (К. Каганец), “калматабровы” [2, 119] (М. Багдановіч), якія падкрэсліваюць рысы знешняга аблічча, псіхалагічны стан герояў.

У адносінах да Ф. Скарыны і Ф. Багушэвіча пісьменнік выкарыстоўвае трапныя азначэнні-перыфразы “вялікі гуманіст” [2, 117], “народны баян” [2, 118], “бацька адраджэння” [2, 118], якія падкрэсліваюць важны унёсак гэтых асоб у культурнае развіццё Айчыны.

Акрамя таго, з традыцыйных літаратурных прыёмаў для раскрыцця характару героя пісьменнік актыўна выкарыстоўвае дыялогі. Выбар самім пісьменнікам для мастацкага адлюстравання менавіта гэтых гістарычных асоб матываваны іх плённай, самаадданай дзейнасцю на ніве нацыянальнай культуры. Акрамя таго, сам М. Гарэцкі ў распрацоўцы нацыянальна-культурнай і мастацка-эстэтычнай праграмы “нашаніўства” быў блізкі па поглядах да многіх літаратараў пачатку XX стагоддзя.

У “Фантазіі” М. Гарэцкім выказваецца думка, што “распятую” [2, 117] за перыяд грамадзянскай вайны краіну можа выратаваць беларуская інтэлігенцыя, на якую ўскладаецца надзвычай важная місія абуджальніка нацыянальнай самасвядомасці, а таксама кансалідацыі сіл. Таму ў згаданым творы выкарыстоўваецца сімвалічны вобраз Купалавага вялікага сходу, на які ўсіх пералічаных вышэй дзеячаў культуры склікае цень беларускага першадрукара, асветніка і гуманіста Францыска Скарыны.

Па прычыне ўзнятых у апавяданні “Фантазія” грамадска-палітычных праблем, яно не магло быць надрукавана ў 1920-я гады і станоўча ацэнена тагачаснай крытыкай, а было прадстаўлена шырокаму колу чытачоў толькі ў другой палове 1950-х гадоў, калі былі сфарміраваны спрыяльныя грамадска-палітычныя ўмовы.

Заўважым, што адной з бясспрэчных заслуг М. Гарэцкага з’яўляецца ўвядзенне ў нацыянальную прозу новага героя – вясковага інтэлігента, які ўсведамляе ўласную адказнасць за лёс народа і будучыню краіны. Духоўнае аблічча і жыццёвая пазіцыя такога героя, у прыватнасці, Лявона Задумы, выразна выяўляюцца ў сацыяльна-псіхалагічнай аповесці “Меланхолія” (1916–1921, 1928). У творы, напоўненым глыбокім філасофскім зместам, закранаюцца такія значныя тэмы, як “інтэлігенцыя і народ”, “шляхі вызвалення ад нацыянальнага прыгнёту” і іншыя.

Як і ў апавяданні “Фантазія”, пісьменнік звяртаецца да мастацкага адлюстравання вобразаў вядомых дзеячаў Беларусі, “вялікіх сыноў краіны” [2, 190], сярод якіх першы беларускі ўсходнеславянскі кнігадрукар Ф. Скарына, К. Каліноўскі, Мацей Бурачок, Я. Купала і Я. Колас. Як і ў папярэднім творы, пісьменнік пазбягае падрабязных апісанняў гэтых дзеячаў і ўзгадвае іх толькі ў кантэксце гаворкі пра Віленшчыну як гістарычны цэнтр развіцця беларускай культуры і зараджэння прагрэсіўных поглядаў, выкарыстоўвае толькі ў адносінах да іх трапныя азначэнні-перыфразы тыпу “вялікі сейбіт гуманізму і асветы” [2, 190] (Ф. Скарына), “адважны правадыр паўстанцаў” [2, 190] (К. Каліноўскі), “бацька нашага адраджэння” [2, 190] (Ф. Багушэвіч), якія яскрава выяўляюць аўтарскія адносіны да іх.

**Заключэнне.** На падставе аналізу характарыстыкі дзеячаў беларускай культуры (Ф. Скарыны, В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, А. Пашкевіч, А. Гаруна, Я. Купалы, М. Багдановіча, І. Луцкевіча, Л. Гмырака, К. Каганца, С. Палуяна, Я. Коласа) ў мастацкім дыскурсе М. Гарэцкага можна зрабіць выснову, што пісьменнік вылучаў у якасці дамінантнай лініі эстэтычнага асэнсавання дзеяча культуры яго ўдзел у нацыястваральнай працы. Мастацкае адлюстраванне дзеячаў айчыннай культуры ў прозе М. Гарэцкага было накіравана на акцэнтаванне ідэі: выдатныя творцы – гэта сведчанне высокага духоўнага, інтэлектуальнага патэнцыялу народа.


1. Мушынскі, М.І. Максім Гарэцкі / М.І. Мушынскі // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы. – Мінск, 1999. – Т. 1. – С. 381–426.
2. Гарэцкі, М.І. Творы: апавяданні, аповесці / М.І. Гарэцкі; уклад. Т.С. Голуб; прадм. М.П. Кенькі. – Мінск: Маст. літ., 1995. – 446 с.




Репозиторий ВГУ